**Альгерд Бахарэвіч**

## Людзі, казкі і ўтопіі

### *Прамова на адкрыцьці літаратурнага фестывалю ў Грааль-Мюрыцы*

Мая любімая казка братоў Грымаў - вельмі кароткая гісторыя пад назвай «Пані Трудэ». Дзяўчынка, імя якой мы ня ведаем, кажа бацькам, што хацела б пабываць у доме пані Трудэ. У тым доме ўсё такое дзівоснае і цудоўнае... Ня дом, а кунсткамэра - або музэй... а, можа быць, лябараторыя? Бацькі строга забараняюць дзяўчынцы туды хадзіць, падазраючы, што фраў Трудэ задумвае нешта нядобрае і што прыйсці да яе - значыць падвергнуцца страшнай небяспецы. Што ж адбываецца далей? Вядома ж, дзяўчынка не падпарадкоўваецца забароне і ідзе да дома пані Трудэ.

*...І калі яна прыйшла, пані Трудэ спытала яе: "Чаму ты такая бледная?" "Ох", - адказала дзяўчынка, дрыжучы ўсім целам, - "я так спалохалася таго, што пабачыла". "Што ж ты пабачыла?" – «Я пабачыла на сходах чорнага чалавека». - "Гэта быў мой вугляр". – "Потым я пабачыла зялёнага чалавека". – «Гэта быў мой паляўнічы». – "Потым я пабачыла крывава-чырвонага чалавека". - "Гэта быў мой мясьнік". – «Ох, пані Трудэ, я так спужалася! Я паглядзела ў акно і замест вас пабачыла д'ябла з агністай грывай!». – «Ох», – сказала пані Трудэ, – «Значыць, ты пабачыла ведзьму ў яе сапраўдным убраньні. Я доўга чакала цябе і сумавала па табе, зараз ты мне крыху пасьвеціш». І пані Трудэ*

*ператварыла дзяўчыну ў цурбак, кінула яго ў агонь, села побач, грэючыся, і сказала: "Як жа ярка ён сьвеціць!"*

...Мы становімся чытачамі ў дзяцінстве -- імі нас робяць казкі. Гэтыя казкі застаюцца ў нашай памяці на ўсё жыццё. Мы можам забыцца імя галоўнага героя адзначанага ўзнагародамі рамана, але імя драўлянага чалавечка ці гаваркога мядзьведзя мы памятаем да самай сьмерці. Літаратура - гэта тэкст, здольны супрацьстаяць забыцьцю. Тое, што ня проста чытаюць, а перачытваюць, зноў і зноў.

Можа падацца, што сучасны чытач жыве ў сьвеце навін, няспынных, як вулічны рух. Але аднойчы, уважліва прыгледзеўшыся, мы раптам знаходзім сябе на пустым скрыжаваньні. На скрыжаваньні казкі, фэнтэзі і ўтопіі.

Фэнтэзі - дзіўны жанр. На першы погляд, гэта казка, але насамрэч -- ўсяго толькі мумія казкі. Бо сапраўдная фантазія ніколі не бывае прадказальнай. Фэнтэзі -- гэта казка, пазбаўленая вантробаў -- сваёй сутнасьці, сваёй арганічнай, першабытнай сілы, сваёй жывой маралі, сваіх крыві і плоці. У фэнтэзі ўсё гэта замяняецца бальзамічнымі рэчывамі. Магчыма, таму фэнтэзі ніколі не палохае нас па-сапраўднаму. Стэрэатыпнае масавае фэнтэзі выключае страх як опцыю, тым самым пазбаўляючы людзей аднаго з найважнейшых мэханізмаў распазнаваньня небясьпекі і набыцьця досьведу. Фэнтэзі пераконвае нас, што ўсё абавязкова будзе добра, што б ні здарылася, і што для гэтага ня трэба прыкладаць ніякіх

намаганьняў. Забясьпечыць нам адкладзены, але гарантаваны гэпі-энд -- вось у чым задача герояў, якія валодаюць магічнай зброяй.

У канцы мінулага стагодзьдзя фэнтэзі пачало дамінаваць у сусветнай літаратуры і культуры, фармуючы густы і сьветапогляд людзей новай эпохі. Магчыма, фэнтэзі – апошняя форма літаратуры, якая ўсё яшчэ ўплывае на грамадзтва. Сёньняшнія дарослыя ва ўзросьце ад дваццаці да сарака пяці гадоў -- гэта людзі, выхаваныя фэнтэзі. Фільмы і кнігі, гульні і сэрыялы... Прынцы й цмокі, дэкаратыўныя чараўнікі і дэкальтаваныя фэі. Праблемы, з якімі сутыкаецца сучасны свет, шмат у чым ёсьць наступствам гэтага выхаваньня, гэтай дрымотнай зачараванасьці.

Каб выжыць сёньня, літаратура шукае самы надзейны і бясьпечны шлях да нашых сэрцаў - і абірае кружную дарогу, абмінаючы гэты спакутаваны свет у пошуку новай вечнай утопіі.

У аснове фэнтэзі ляжыць жорсткая ерархія. Лёсы яе герояў заўсёды ёсьць вяртаньнем да залатога веку, аднаўленьнем статус-кво, здабыцьцём страчаных валадарстваў, увогуле: вяртаньне, рэканструкцыя, мінулае -- вось што тут найважнейшае. Місія фэнтэзійных герояў - аднавіць разбураную ерархію. Фэнтэзі заўсёды манархічнае, манахромнае, маніякальна засяроджанае на выкананьні місіі. Манаполія на прыняцьце рашэньняў у ім належыць арыстакратыі. Галоўныя

героі могуць перажываць любыя прыгоды, але іх мэта -- не дапусьціць аніякае мадэрнізацыі.

Я спрабую уявіць старую эўрапейскую казку "Пані Трудэ" як фэнтэзійны тэкст. Мая маленькая казка супраціўляецца. Тым ня менш яе можна перапісаць так, каб яна адпавядала законам самага папулярнага жанру. Першая апэрацыя, якую неабходна выканаць - гэта змена полу. Мы мусім тэрмінова зьмяніць гендэр няшчаснай гераіні. Максымум, на што можа разлічваць дзяўчына, - гэта быць спадарожніцай галоўнага героя, хітрай, але празьмерна эмацыйнай палоннай уласнага пубэртату. Вось жа, замест дзяўчыны перад намі -- адважны юнак, які рашуча прыходзіць у хату пані Трудэ, і калі ведзьма спрабуе ператварыць яго ў цурбак, ён выкрывае яе на месцы злачынства і адсякае ёй галаву. Неўзабаве робіцца ясна, што ён ня проста нікчэмны хлапчук, а зусім юны кароль чараўнікоў, які пасяліўся некалі ў гэтым убогім гарадку, каб зьнішчыць зло і ачысьціць зямлю ад вядзьмарства. Юнак шынкуе на часткі аднаго за адным Чорнага, Зялёнага і Чырвонага Чалавека, жэніцца зь дзяўчынай і робіцца ўладаром краіны -- і ўсё пачынаецца спачатку.

Праблема ў тым, што ў фэнтэзі ніхто па-сапраўднаму не памірае. Сьмерці для фэнтэзі не існуе, хоць яна, сьмерць, ёсьць неад'емнай катэгорыяй быцьця. Ніводны жанр не прапануе такога ідэалістычнага сьветапогляду, нідзе сьмерць не заслугоўвае такой пагарды, як у фэнтэзі. Кожны герой гатовы рана ці позна паўстаць зь мёртвых і працягнуць барацьбу. Людзі, выхаваныя на фэнтэзі і пазбаўленыя крытычнага мысьленьня,

пераносяць гэтую неўміручасьць у рэальны свет. А там, дзе немагчыма памерці, чалавечае жыцьцё нічога не каштуе, нягледзячы на ўвесь гуманістычны дэкор і ўвесь драматызм.

Мы можам уявіць сабе тую самую казку і ў выглядзе ўтопіі. Утопіі, у якой гараджане даведваюцца пра зьнікненьне дзяўчынкі, прыходзяць да дома пані Трудэ, вешаюць яе на яблыні і аднагалосна прымаюць закон, паводле якога зь сёньняшняга дня забаронена: рабіць незразумелыя рэчы дома, хадзіць у дзіўныя месцы і насіць агністыя грывы. Таксама недапушчальна сяліцца ў горадзе чужынцам. І наогул: з гэтага моманту забараняецца спазнаваць зло. Замест гэтага трэба рабіць выгляд, што ніякага зла не існуе: свайго роду "культура адмены". Згодна з новым законам, цяпер назаўжды забаронена задаваць адвечнае пытаньне: што ж адбываецца там, у тым таямнічым доме, дзе вокны сьвецяцца так прыцягальна і так злавесна, кожную ноч?

Але хіба ня ў гэтым найважнейшая задача літаратуры? Выпраўляцца туды, дзе ніхто яшчэ не бываў, туды, дзе цёмна і страшна, туды, куды ісці забаронена, туды, дзе цябе можа паглынуць полымя амбіцый, агонь адкрыцьцяў, дзе ты можаш стаць саўдзельнікамператварэньня? Выпраўляцца ў падарожжа, каб знайсці свой уласны, непаўторны голас -- які, хто ведае, можа зрабіцца ўсяго толькі тваім перадсмяротным крыкам? Браць на сябе адказнасьць і несьці яе, ня слухаючы здаровага розуму -- якому, як пісаў Набокаў у сваім знакамітым эсэ, мастак мусіць стрэліць проста ў сэрца? Аднойчы выправіцца ў дарогу,

каб навучыцца страху -- як запавядае нам іншая казка братоў Грымаў.

Фэадальны фэнтэзійны сьвет ня мае ніякага дачыненьня да дэмакратыі і правоў чалавека; падобныя рэчы яго не цікавяць. Калі ты гоблін, адзінарог або гном, ты застанешся ім назаўжды.

Фэнтэзі - гэта дэманстратыўнае адмаўленьне гісторыі. Нежаданьне ведаць гісторыю, нежаданьне вучыць яе ўрокі. Навошта нам ведаць штосьці пра эўрапейскае Сярэднявечча, калі значэньне мае толькі генэалягічнае дрэва выдуманых тытанаў? У сучасным сьвеце людзі ведаюць пра геапалітыку эльфаў значна больш, чым, напрыклад, пра Вялікае княства Літоўскае, адну з найважнейшых эўрапейскіх дзяржаваў сярэднявечнай Еўропы. Многія сучасныя эўрапейцы сёньня ня могуць назваць усе краіны Эўразьвязу, ня кажучы ўжо пра тое, каб сказаць, дзе дакладна тыя краіны знаходзяцца; яны шмат гавораць пра абарону сваіх межаў, але маюць толькі вельмі прыблізнае ўяўленьне пра тое, зь якімі краінамі і народамі мяжуе іхная. Многія сучасныя эўрапейцы ведаюць пра гоблінаў і феяў значна больш, чым пра Крыжовыя паходы, Стогадовую вайну, Галадамор ва Украіне і Вялікі Голад у Ірляндыі, хоць усе гэтыя падзеі маглі б шмат чаму нас навучыць. У гэты сьвет прыходзіць усё больш і больш людзей, якія называюць сябе палітыкамі і абяцаюць вырашыць усе нашыя праблемы. І сёньня гэта збольшага людзі, апантаныя фэнтэзі. Яны паводзяцца так, нібы зьбіраюцца жыць вечна. І гэта праўда -- некаторыя з іх сур'ёзна падумваюць пра крыёніку, каб аднойчы ўваскрэснуць,

быццам героі фэнтэзі, і зьмяніць нашу будучыню знутры. Яны вучыліся ў найлепшых унівэрсытэтах -- і ў той самы час ганарацца сваім гістарычным невуцтвам, сваёй інтэлектуальнай некампэтэнтнасьцю. Вярнуць нас у залаты век, у слаўнае мінулае -- вось за што яны змагаюцца. У “залаты век”, якога ніколі не было. Зноў зрабіць нас падданымі суровага і мудрага караля. Аддаць нашае права вызначаць будучыню тыранам -- але гэтым разам тыранам з самымі сучаснымі тэхналёгіямі. Сёньняшнія жыхары Захаду ўсё радзей сочаць за палітычнымі навінамі, ратуючыся ад стрэсу, бездапаможнасьці і немагчымасьці штосьці зьмяніць. Усе стаміліся ад сьвету, поўнага пагрозаў і гвалту. Людзі ўцякаюць у свет фэнтэзі, дзе ад іх нічога не залежыць і дзе ўсё заўсёды сканчаецца добра. І як вынік: прастора для спэкуляцый адкрытая. Да ўлады прыходзяць багатыя папулісты і лятэнтныя фашысты, славалюбныя фанатыкі і крывадушныя ксэнафобы. Яны нясуць з сабой свае вэрсіі ўтапічнага шчасьця, старыя як сьвет, але размаляваныя штучным інтэлектам у колеры будучыні.

Сёньня з чалавекам зноў гаворыць утопія; яна пераконвае, што ідэальны свет магчымы -- неабходна толькі пазбавіцца ад тых, хто перашкаджае нашаму агульнаму шчасьцю. Зноў пануе ўтапічнае мысленьне; утопія рэклямуе сябе паўсюль, і гэта майстэрскі маркетынг. Імпэрска-фашысцкая ўтопія пуцінскай Расеі. Эўрапейская ўтопія, у якой доўгі час не было месца для Украіны і Беларусі, але такое месца знайшлося для Вугоршчыны Орбана і Славаччыны Фіца. Амэрыканская ўтопія Трампа, пэрсаніфікаваная нацыянальная манія велічы, якая сёньня

пагражае ня толькі ЗША, але і ўсяму сьвету. Левая ўтопія ўсеагульнай роўнасьці, якая, калі мы зірнем на сусьветную гісторыю, заўсёды прыводзіла да масавых забойстваў і крывавых катастроф. Утопія ўнівэрсальнага лібэралізму. Літаратурная ўтопія, у якой кніга -- гэта вянец тварэння. Утопія паліткарэктнай культуры. Рэлігійная ўтопія нафтавых дэспатый. Кожная ўтопія -- чарговая няўдалая спроба патлумачыць сьвет.

Нават мова можа зрабіцца ўтопіяй. Галоўны герой майго рамана “Сабакі Эўропы”, Алег Алегавіч, стварае сваю мову, бальбуту, і гэта таксама ўтопія, моўная ўтопія свабоды. Гэта мова, вольная ад ерархій, нянавісьці, патрыярхату і дыскрымінацыі, але таксама вольная і ад людзей. Людзі для ўтопіі ня важныя. Важны толькі чалавечы рэсурс, які выдзяляюцца на яе рэалізацыю. Напрыклад, мір з Пуціным і яго імпэрыяй азначае, што мільёны ўкраінцаў патрапяць у імпэрскае рабства, і каму якая справа, што яны гэтага не жадаюць і хутчэй памруць у баі, чым зробяцца «рускімі». Але ўтопія такога сьвету можа лёгка праглынуць мільёны людзей, і пры гэтым не падавіцца. Гэтая ўтопія робіцца на нашых вачах новым сучасным фэнтэзі, дзе адны народжаныя быць рабамі "Вeлiкого Русского Міра", а іншыя - спакойна назіраць за гэтым са сваіх высокіх вежаў. Вось яна, вялікая прадвызначанасьць палітычнага фэнтэзі, злавесная прэдэстынацыя новага сьвету.

Людзям патрэбны казкі, каб заставацца людзьмі.

Толькі казкі па-сапраўднаму гавораць нам пра чалавека. Пра тое, якое гэта - быць чалавекам у сьвеце прыроды, ідэй і мэханізмаў. Толькі казкі могуць папярэдзіць нас пра новыя катастрофы. Толькі казкі могуць вучыць нас, не ўпадаючы ў ідэалізм новых дыктатур. У адрозьненне ад утопіяў, казкі заўсёды жывуць у мінулым, сучаснасьці і будучыні. Казка -- самая чыстая літаратура. Казка і паэзія -- найвышэйшы ўзровень мовы.

Я нарадзіўся і вырас пасярод вялікай утопіі. У Савецкім Саюзе, у Беларусі, пра якую тады на Захадзе амаль нічога ня ведалі, бо мэтай утопіі было яе зьнікненьне. У горадзе Менску, дзе беларуская мова амаль вымерла, бо гэтага патрабавала савецкая ўтопія. Утопія спрабавала ператварыць мяне ў утапічную істоту - пазагістарычнага савецкага чалавека, які гаворыць па-расейску, ня мае нацыянальнасці, верыць у перамогу камунізму і гатовы аддаць жыцьцё за гэтую вялікую ўтопію, за яе вялікія дасягненьні - ГУЛАГ, Гагарына, атамную бомбу, карную псыхіятрыю, акупацыю іншых краін і шматтысячную герантафілічную партакратыю. Як і мільёны іншых людзей, я зь дзяцінства быў акружаны прапагандысцкімі казкамі пра новых сьвятых – Леніна і піянэраў-герояў, дасьціпных кадэбэшнікаў і чырвоных камікадзэ, пра добрых камісараў і злых заходніх шпіёнаў. І калі нам чыталі народныя казкі, гэта былі звычайна расейскія казкі. Пра магутных рускіх волатаў - і пра подлых замежнікаў. Пра вялікі "рускі дух" і пра расейскага дурня Ямелю на печы. Пра духоўную перавагу Расеі над рацыянальным і бяздушным Захадам.

Але канец савецкай утопіі быў ужо блізкі. Перабудова была спробай мадэрнізаваць утопію і надаць ёй новую сілу. Але ў аснове ўтопіі ня можа знаходзіцца чалавек. Дэмакратычных імпэрый не бывае. Фатальная памылка Захаду, зробленая ў часы распаду СССР -- заходніх палітыкі наіўна паверылі ў тое, што Расея можа зрабіцца дэмакратычнай, застаючыся пры гэтым імпэрыяй, турмой народаў. Народаў, пра якія на Захадзе ніхто не хацеў чуць – усіх гэтых ўкраінцаў, беларусаў, чачэнцаў, якутаў, татараў… Расея здавалася Захаду аднастайнай і маналітнай.

Гарбачоўская перабудова 1980-х гадоў адмяніла цэнзуру. Мы адкрылі для сябе забароненыя кнігі і чыталі іх з такой нецярплівасьцю, нібы заўтра іх маглі ў нас зноў адабраць. Гэтыя кнігі яшчэ нядаўна забароненых аўтараў перакулілі мой сьвет і сфармавалі каштоўнасьці, што зпастаюцца для мяне важнымі і сёньня. Яны зрабілі зь мяне эўрапейца, натхнілі мяне марыць пра вольную эўрапейскую Беларусь. Джойс і Кафка, Набокаў і Орўэл, Гамбровіч і Мрожак, Вірджынія Вулф, Елінжк і Сыльвія Плят,  Наталі Сарот і Вацлаў Гавэл -- гэтыя і многія іншыя забароненыя і непажаданыя аўтары навучылі мяне думаць. У той час мы адкрывалі для сябе іншую беларускую літаратуру -- тую, якую ад нас хавалі, тую, пра якую нам ніхто не расказваў. Гнаную, фізычна вынішчаную бальшавікамі, забытую ў імя расейска-савецкай імпэрскай утопіі...

Вельмі хутка я апынуўся ў іншай утопіі — утопіі дзяржавы Лукашэнкі, усярэдзіне мёртвага асколка ўтопіі савецкай. Яе асновай дыктатар абвясьціў так званую «стабільнасьць». Так на

мове гэтага ўбогагa дробнага утапіста называлася створаная ім сыстэма. Тырана, які ў першыя ж гады свайго кіраваньня пахваліў Гітлера за яго прыхільнасьць да парадку і за аб'яднаньне нацыі -- пахваліў цалкам публічна, у інтэрв'ю нямецкай газэце «Handelsblatt». Утопія Лукашэнкі — гэта спроба спыніць час і забараніць яго. Не дазволіць Беларусі быць удзельніцай эўрапейскай гісторыі, штучна выдаліць яе яе з гістарычнага працэсу. Спыніць на гадзіньніку стрэлкі і гвалтоўна павярнуць іх назад.

Больш за ўсё тыраны баяцца часу, бо ён ім непадуладны. Будучыня заўсёды азначае сьмерць тырана. Мільёны людзей зрабіліся ахвярамі маленькай утопіі вялікага злачынцы Лукашэнкі. Тысячы ахвяраў гвалту і палітзьняволеных, сотні тысяч палітэмігрантаў, замучаныя і забітыя ў турмах беларусы, зруйнаваны лёс цэлага народу -- вось цана, якую мы плацім за той асколак утопіі, што калісьці, як у казцы, патрапіў у сэрца Беларусі і ператварыў яе ў ганебнае пасмешышча і ізгоя, а затым і ў саўдзельніка агрэсіі ў імпэрыялістычнай вайне.

Як і ўсе ўтапісты, Лукашэнка пакутуе ад маніі велічы. Пасьля 2020 году ён кінуў выклік кнігам. Ня толькі кнігам па гісторыі, публіцыстыцы, навуковым дасьледаваньням. Сёньня ягоны рэжым забараняе казкі.

Увогуле, кожны літаратурны твор, створаны чалавечым уяўленьнем і сілай мовы, заснаваны на старажытнай казцы. Кожны раман ёсьць сучаснай казкай -- высакародным падманам,

у які мы можам верыць або не, але мы заўсёды прызнаем права аўтара прыдумаць для нас сьвет і людзей у ім. Адкрываючы кнігу, мы заключаем з аўтарам угоду. “Мы паспрабуем табе паверыць. -- шэпчам мы, -- нават ведаючы, што тое, пра што ты кажаш, ніколі не адбывалася. Мы паспрабуем, але не гарантуем, што дачытаем тваю казку да канца”. Мы нібы дзеці на зары часоў, якія ля вогнішча ў пячоры прыслухоўваюцца да воўчага выцьця, да шуму дажджу і ветру. Чаму гэта адвеку было для нас так важна -- і чаму нават сёньня дарослыя людзі пішуць і чытаюць казкі?

Людзі любяць казкі, нават калі баяцца ў гэтым прызнацца. Любяць – і часам забараняюць іх заканадаўча. Спальваюць іх, зьнішчаюць, хаваюць ад іншых людзей, наклейваюць на іх ганебныя цэтлікі. Менавіта гэта адбылося з маім раманам “Сабакі Эўропы”. 8 красавіка 2021 году новы наклад гэтай кнігі быў канфіскаваны беларускай мытняй на мяжы зь Літвой. Раман быў прызнаны экстрэмісцкай літаратурай і стаў першым мастацкім творам у гісторыі Беларусі, афіцыйна забароненым дзяржавай паводле судовага рашэньня і ўнесеным у сьпіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

Так, у маім рамане я пішу пра 2049 год. Расейская імпэрыя даўно анэксавала Беларусь і суседнія зь ёй дзяржавы і абвясьціла вайну вольнаму сьвету. Пасьля вайны з Расеяй адзіная Эўропа перастала існаваць. Фетышызацыя межаў зрабілася пачаткам распаду эўрапейскай супольнасьці. Я напісаў гэты раман у 2016/17 годзе. Гэта кніга пра ўладу мовы і мову ўлады, пра

Эўропу як беларускі сон і Беларусь як эўрапейскую выспу. Так, гэты раман - мая вялікая сатыра на расейскую і беларускую ўтопіі і мой маркотны гімн літаратуры. Але гэта ўсяго толькі казка. Казка, якая, здавалася б, ня мусіць палохаць дарослых дзяржаўных дзеячаў, якія баяцца насамрэч толькі аднаго - быць аднойчы пакаранымі за свае злачынствы. Проста казка...

Неўзабаве беларускі суд прызнаў экстрэмісцкай і забараніў іншую маю кнігу - "Апошнюю кнігу пана А". Дзіўна, але гэта акурат сучасная казка. Цяпер усе мае кнігі забароненыя ў Беларусі. Дзяржава спрабуе адрэзаць мяне ад маіх беларускіх чытачоў. Яна забываецца, што інтэрнэт усё яшчэ працуе. Яна забываецца, што Беларусь пасьля 2020 году страціла больш за 300 000 чалавек, у тым ліку не толькі выдаўцоў, аўтараў і літаратурных крытыкаў, але найперш -- чытачоў. Усіх тых, хто пакінуў краіну і выправіўся ў выгнаньне. Гэта вельмі вялікая чытацкая супольнасьць. Мець дома забароненую кнігу  для беларусаў цяпер -- справа гонару.

Сёння ў Беларусі і Расеі забаронена так шмат кніг, якія належаць да катэгорыі "мастацкая літаратура", што непазьбежна ўзьнікае пытаньне: што ж такога небясьпечнага ў гэтых творах, поўных выдуманых пэрсанажаў і канфліктаў? Гэта ж вымысел, прыпавесьці, казкі, чыстая фантазія, выдуманыя гісторыі пра тое,  чаго ніколі не было? Але рэч у тым, што такія тэксты ствараюць зусім некантраляваную прастору ўспрыманьня, прастору для вольнай думкі. Аўтарытарная дзяржава не можа супрацьстаяць казкам, бо толькі той, хто ўмее чытаць, можа

апынуцца па той бок уяўленьня. І гэты бок ім недаступны, яны бясьсільныя перад яго вясёлым вар'яцтвам. Мова і літаратура, казка і фантазія - гэта свет, у якім неяк арыентавацца можна, толькі калі ты здольны ацаніць усю красу «Алісы ў Краіне цудаў».

Сьвятлана Алексіевіч - на сёньня адзіная беларуская ляўрэатка Нобэлеўскай прэміі па літаратуры. Яе выдатныя дакументальныя даследаваньні Чырвонага Чалавека, Савецкай імпэрыі, Чарнобыльскай катастрофы і жанчын на вайне заснаваныя на жывых сьведчаньнях. Яе кнігі - гэта спроба даць голас тысячам людзей, каб увесь свет даведаўся пра іх досьвед. Нобэлеўская прэмія для Сьвятланы Алексіевіч стала прызнаннем паноўнай ролі дакумэнтальнай літаратуры, нон-фікшна, у сучасным сьвеце. Навошта нам казка, калі мы хочам ведаць праўду? Мы абіраем фэнтэзі, калі нам трэба пакінуць гэты свет, і журналістыку, каб у ім застацца.

Аднак катастрофы і трагедыі працягваюць адбывацца. Ніякая праўда не дапамагла людзям зразумець, чаму яны масава гінуць у імя вялікіх ідэй і асабістых маній тыранаў, і чаму тыраны набываюць усё больш пасьлядоўнікаў. Ніякая голая праўда ня здолела спыніць войны і тэрор. Праўда без казак - гэта ўсяго толькі інфармацыя, якой можна бясконца маніпуляваць. Хоць у навінах і дакумэнтальных кнігах мы чытаем пра ўсё новыя і новыя факты пра жахі таталітарных рэжымаў і новага фашызму, мы ўсё роўна зьвяртаемся да казак, каб патлумачыць сьвет.

Кафку і Оруэла, Ёнэска і Брэдбэры цяпер чытаюць так, быццам яны напісалі свае вялікія раманы сёньня.

Літаратура - слабое абязбольнае, але яна надае болю сэнс.

Я стаю тут перад вамі, у Грааль-Мюрыцы, дзе сто гадоў таму сьмяротна хворы візыянэр Франц Кафка сустрэў сваё апошняе каханьне, і думаю, што ўсе вялікія тэксты Кафкі для мяне - гэта геніяльныя казкі, напісаныя жывым чалавекам. Гэта тэксты, якія не магла б напісаць ніводная машына. "Працэс" і "Замак", "Ператварэньне" і "У папраўчай калоніі для зьняволеных" - гэта гісторыі-папярэджаньні, гісторыі пра вусьцішныя месцы, куды іншыя не наважвалісяісьці. І той факт, што многія творы Кафкі захаваліся ў тым выглядзе, у якім яны былі апублікаваныя Максам Бродам, таксама сьведчыць пра іх казачны характар. Казка ўвесь час дапаўняецца і перапісваецца, пераказваецца і зьмяняецца, і ў такім выглядзе перадаецца новым пакаленьням.

"Калі я асуджаны, дык асуджаны ня толькі на тое, каб аднойчы маё жыццё скончылася, але і асуджаны абараняцца да самага канца", - напісаў аднойчы Кафка. Літаратура, казкі, фэнтэзі і проза -- гэта нашыя спробы абараніць сябе ў сьвеце утопіяў і банальных штампаў. Апошняя надзея бяссільных -- прыдумаць свету, у якім мова нарэшце зможа сказаць нам праўду.

Толькі калі мы па-сапраўднаму спалохаемся сябе і таго, што зрабілі, мы маем шанец на ацаленьне.

Фантазія супраць фэнтэзі, утопія супраць утопіі, ідэалёгія супраць ідэалёгіі, правыя супраць левых. Наіўнае заходняе фэнтэзі супраць шавіністычнага расейскага. Нэанацызм, ксэнафобія. Агідны застарэлы антысэмітызм, які цяпер зноў разгараецца і тлее, увесь час знаходзячы новых прыхільнікаў, - таму што людзі, якія вызнаюць яго, нічога ня ведаюць пра сьвет, у якім жывуць, не жадаюць ведаць яго гісторыю, таму што прывыклі да думкі, што гэта ў парадку рэчаў -- сьвет, у якім валадараць высакародныя каралі, сьвет, у якім ёсьць найвышэйшая раса і ёсьць адрынутыя народы, што маюць быць зьнішчаныя. «Паўбог» Пуцін, які лётае ў снах на арле і ўяўляе сябе героем фантастычных фільмаў, – і недалёкі вядзьмар Лукашэнка, які падчас засухі сур'ёзна заяўляе на ўсю краіну: «Вы хацелі дождж? Я даў вам дождж». Чараўнік Трамп, які верыць у сваю звышчалавечую здольнасьць скончыць вайну за адзін дзень, - і паўтарае сваю хлусьню год за годам, пакуль у яе не паверацць мільёны. Паўсюль пануе выдумка, і ніхто не ведае, чым яна стане заўтра: казкай, фантастыкай, новай утопіяй ці прапагандысцкім шаленствам.

У апошнія дзесяцігодзьдзі Савецкага Саюза сярод нас, школьнікаў, былі папулярныя гісторыі з гарадзкога дзіцячага фальклёру. Напрыклад, гісторыя пра таемную арганізацыю «Сьмерць савецкім дзецям». Хадзілі чуткі, што яе чальцы разьяжджаюць па горадзе на чорных машынах з танаваным шклом, выкрадаюць дзяцей і катуюць іх у сваіх цёмных склепах. Нам тады было і сьмешна, і страшна... Праз шмат гадоў, у 2020 годзе, мы, дарослыя,  з жахам назіралі, як па горадзе Менску

езьдзяць самыя сапраўдныя мікрааўтобусы з танаваным шклом, з якіх раптам выскокваюць невядомыя людзі ў масках і выкрадаюць людзей проста пасярод вуліцы. Страшныя гісторыя заўсёды сярод нас, трэба толькі правільна іх запісаць і ўважліва прачытаць.

Час абараніць казку. Яна -- той вялікі еўрапейскі сумнеў, які калісьці спарадзіў вялікую культуру і вялікія катастрофы. Менавіта Эўропа, зь яе вялікімі казкамі, першай задумала і ўвасобіла ў жыцьцё ідэю масавай дэгуманізацыі, але і менавіта Эўропа першай пачала разумець яе маштабы і прычыны. Эўрапейская казка доўга стварала новыя сэнсы для ўсяго сьвету, і сёньня яна як ніколі важная для саміх эўрапейцаў. Таму што менавіта сэнсу не хапае сёньня там, дзе дзьве імперыі - Савецкая і амэрыканская - сёньня пакідаюць пустэчу і расчараваньне ў сваіх утопіях.

Мэта перасьледу - перасьлед. Мэта катаваньня - катаваньне. Мэта ўлады - улада. Так вучыць утопія, апісаная ў найвялікшай казцы: рамане «1984». І яны - я называю іх "яны", як у кнізе - працягваюць перасьледваць і катаваць, яны ўсё яшчэ пры ўладзе. Тут і цяпер.

Дык у чым жа мэта казкі?

Ня ведаю. Але я ведаю: калі мы ёсьць іхнай цэльлю -- у нашых сілах прымусіць іх прамахнуцца.